УДК 392:273.2(476.5)

**У. Я. Аўсейчык**

# РАССЯЛЕННЕ І ДЭМАГРАФІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА СТАРАВЕРАЎ ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

Во введении обозначены актуальность и цель исследования, коротко охарактеризована историография проблемы. Сделан вывод об отсутствии специальных работ, посвященных данному вопросу. Указано, что цель исследования состоит в выявлении особенностей расселения и анализе демографических процессов у старообрядцев северо-западной части Беларуси в XIX – начале XX в. Определены территориальные границы исследования, которые охватывают северо-западную Беларусь. В соответствии с административно-территориальным делением второй половины XIX – начала XX в. в качестве региона выступают территории восточных уездов Виленской губернии и восточной части Новоалександровского уезда Ковенской губернии. Определена источниковедческая база исследования. Ей стал комплекс статистических материалов второй половины XIX – начала XX в. В основной части работы выявлены особенности расселения и приведена демографическая характеристика старообрядческого населения северо-западной Беларуси на основе материалов второй половины XIX – начала XX в. В статье рассмотрена динамика численности старообрядческого населения в регионе в целом и по отдельным административным единицам. Выделены основные места их компактного проживания в границах региона, проанализировано соотношение сельского и городского старообрядческого населения, выявлены городские центры староверов в северо-западной Беларуси. В заключении сделан вывод о том, что северо-западная часть Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. являлась регионом компактного проживания старообрядцев. Во второй половине XIX – начале XX в. наблюдается устойчивое увеличение старообрядческого населения в этой части страны. Большая часть старообрядческого населения региона проживала в сельской местности, доля горожан среди старообрядцев была небольшой. В результате социально-экономических и политических процессов второй половины XIX – начала XX в. активизирована миграция старообрядческого населения как в регионе, так и за его пределы.

***Ключевые слова:*** старообрядцы, северо-западная Беларусь, расселение, население, демографические процессы, статистические материалы.

**Уводзіны.** Тэрыторыя паўночна-заходняй Беларусі з'яўляецца месцам кампактнага пражывання рускіх старавераў, якія пасяляюцца на гэтых землях з сярэдзіны XVII ст. Рэгіён з'яўляецца адным з асноўных цэнтраў старaверства на беларускіх землях. Такая сітуацыя характэрна як у мінулым, так і ў сучасны перыяд. Менавіта ў паўночна-заходняй частцы Беларусі знаходзіцца большасць старaверскіх абшчын у наш час. Нягледзячы на гэта, у беларускай навуцы гісторыя і культурныя традыцыі старавераў у гэтым рэгіёне разгледжаны не дастаткова [1]. Дадзены артыкул прысвечаны разгляду асаблівасцей рассялення і дэмаграфічных працэсаў у старавераў Паўночнай Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

У беларускім народазнаўстве пытанні, звязаныя са спецыфікай рассялення старавераў у паўночна-заходняй частцы Беларусі, іх колькасці, арэалаў пражывання, дэмаграфічных працэсаў у XIX – першай палове XX ст., застаюцца да канца не вырашанымі. Шэраг навукоўцаў прадпрымалі спробы даследавання асобных аспектаў гэтых праблем. У першую чаргу гэта датычыцца асаблівасцей рассялення старавераў на паўночнабеларускіх землях. Беларускі гісторык А. А. Гарбацкі вылучыў асноўныя арэалы першапачатковага пасялення ў другой палове XVII–XVIII ст., прывёў статыстычныя даныя па асобных адміністрацыйных адзінках у XIX – пачатку XX ст. [2]. Але пры падліку колькасці старавераў у канцы 1830–1840-х гг. у межах Беларусі навуковец даныя па беларускіх паветах Віленскай губерні ўвогуле не ўлічыў [2, с. 105]. На аснове палявых даследаванняў канца XX ст. даследчык Н. Я. Мініна вызначыла

***Аўсейчык Уладзімір Яўгенавіч,*** канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі і турызму ПДУ (Беларусь).
***Адрас для карэспандэнцыі:*** вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк, Беларусь; e-mail: u.auseichyk@psu.by

© «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», 2021

агульныя рысы арэалаў пасялення стараевераў у межах Віцебскай вобласці [3, с. 6]. Літоўскія даследчыкі Г. У. Паташанка і Н. А. Марозава разглядалі пытанні рассялення старавераў на беларуска-літоўска-латвійскім памежжы. Гісторык Г. У. Паташанка ахарактарызаваў геаграфію іх рассялення, прадпрыняў спробу прасачыць дэмаграфічныя змены на працягу XVII – пачатку XIX ст. [4]. Даследчык Н. А. Марозава вызначыла арэалы рассялення старавераў на літоўскіх і памежных з імі беларускіх і латвійскіх землях на аснове матэрыялаў пачатку XX ст., статыстычных даных і палявых даследаванняў другой паловы XX – пачатку XXI ст. [5].

Мэта дадзенай працы – выявіць асаблівасці рассялення і прааналізаваць дэмаграфічныя працэсы ў старавераў паўночна-заходняй часткі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст.

Тэрытарыяльныя межы даследавання ахопліваюць паўночна-заходнюю Беларусь. У адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам другой паловы XIX – пачатку XX ст. рэгіён будуць складаць тэрыторыі ўсходніх паветаў Віленскай губерні (Вілейскі, Дзісенскі, Ашмянскі паветы, беларускія землі Свянцянскага павета) і ўсходняй часткі Новааляксандраўскага павета Ковенскай губерні (малюнак 1). Іншыя тэрыторыі Віленскай, Гродзенскай, паўночна-заходняй часткі Мінскай губерняў не будуць уваходзіць у геаграфічныя межы даследавання, паколькі старавераў на гэтых землях амаль не налічвалася (гл. ніжэй).

Крыніцазнаўчай базай даследавання сталі статыстычныя матэрыялы па стараверскаму насельніцтву рэгіёна ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Менавіта гэты перыяд характарызуецца наяўнасцю дастатковай колькасці статыстычных даных, якія дазваляюць дасягнуць пастаўленай мэты. Па больш ранніх перыядах такая інфармацыя фрагментарная і няпоўная. У другой палове XIX – пачатку XX ст. значны аб'ём статыстычных даных па дадзенай праблематыцы быў апублікаваны. Важныя звесткі ўтрымліваюцца ў штогадовых «Памятных кніжках» і «Аглядах» па асобных губернях, а таксама матэрыялах перапісу 1897 г.




**Малюнак 1 – Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел у паўночна-заходняй частцы Беларусі і сумежных тэрыторый у другой палове XIX – пачатку XX ст.**

**Асаблівасці рассялення.** Значная частка стараверскага насельніцтва пражывала на тэрыторыі Віленскай губерні. Як сведчаць крыніцы, большасць старавераў губерні былі федасееўцамі. У Табліцы 1 прадстаўлена колькасць старавераў на тэрыторыі Віленскай губерні ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

Табліца 1 – Дынаміка колькасці стараверскага насельніцтва ў Віленскай губерні (1860–1911 гг.)

| Год | 1860 | 1868 | 1873 | 1878 | 1882 | 1886 | 1891 | 1897 | 1902 | 1907 | 1911 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць стараавераў (чал.) | 12 251 | 14 913 | 16 450 | 18 283 | 19 825 | 23 381 | 24 850 | 25 673 | 24 530 | 26 817 | 30 478 |
| Крыніца: складзена аўтарам на аснове [6, с. 73; 7, с. V; 8, с. VII; 9, с. VI; 10, с. IV; 11, с. 6, 7; 12, с. 8, 9; 13, с. 60; 14, с. 3; 15, с. 3; 16, с. 2]. Інфармацыя на 1897 г. прыведзена згодна з перапісам 1897 г. У адпаведнасці з данымі, якія прадстаўлены ў Памятнай кніжцы Віленскай губерні на 1899 г., на тэрыторыі губерні налічвалася 24 130 стараавераў [17, с. 98]. | | | | | | | | | | | |

Як вынікае са статыстычных даных, сярод беларускіх паветаў (гэта значыць тых, тэрыторыя якіх у сучасны перыяд уваходзіць у склад Беларусі) старааверы пражывалі ў Дзісенскім, Свянцянскім, Вілейскім, Ашмянскім і Лідскім. Аднак колькасць стараавераў у Лідскім павеце была зусім нязначнай. Па некаторых гадах у другой палове XIX ст. старааверы ў Лідскім павеце ўвогуле не фіксаваліся. На поўдзень ад гэтых паветаў (на тэрыторыі Гродзенскай губерні, Мінскага і Навагрудскага паветаў Мінскай губерні) старааверы амаль не пражывалі [18, с. 100; 19, с. 78].

Асноўная маса стараавераў Віленскай губерні пражывала ў Дзісенскім і Свянцянскім паветах. Калі ў другой палове XIX ст. назіраецца перавага Свянцянскага павета над Дзісенскім па колькасці стараавераў (табліца 2), то з канца XIX ст. сітуацыя становіцца адваротнай. З гэтага часу ў Дзісенскім павеце старааверы колькасна пераважаюць. Упершыню пра гэта сведчаць даныя перапісу 1897 г. (табліца 2). Такая ж сітуацыя характэрна і ў наступныя гады. Так, у 1903 г. у Дзісенскім павеце налічвалася 9526 стараавераў, а ў Свянцянскім – 8198, у 1908 г. у Дзісенскім павеце было налічана 9558, а ў Свянцянскім – 7641, у 1911 г. у Дзісенскім – 9866, а у Свянцянскім – 7756 [20, с. 45; 21, с. 49; 22, с. 54]. Пэўная частка стараавераў пражывала таксама ў Вілейскім і Ашмянскім паветах (табліца 2).

Табліца 2 – Дынаміка колькасці стараверскага насельніцтва ў Дзісенскім, Свянцянскім, Вілейскім і Ашмянскім паветах Віленскай губерні (1843–1897 гг.)

| Год | Колькасць стараавераў у паветах Віленскай губерні (чал.) | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Дзісенскі | Свянцянскі | Вілейскі | Ашмянскі |
| 1843 | 3 884 | 4 911 | 392 | 191 |
| 1868 | 3 921 | 4 731 | 483 | 463 |
| 1873 | 4 264 | 5 045 | 540 | 570 |
| 1876 | 4 453 | 5 452 | 552 | 828 |
| 1878 | 4 729 | 5 492 | 550 | 814 |
| 1882 | 5 238 | 6 442 | 534 | 445 |
| 1886 | 5 580 | 9 487 | 540 | 483 |
| 1891 | 6 445 | 9 849 | 566 | 488 |
| 1894 | 6 895 | 10 164 | 640 | 488 |
| 1897 | 9 484 | 7 974 | 531 | 516 |
| Крыніца: складзена аўтарам на аснове [23, с. 170, 171; 7, с. V; 8, с. VII; 24, с. VII; 9, с. VI; 10, с. IV; 11, с. 6, 7; 12, с. 8, 9; 25, с. 6, 7; 13, с. 54]. | | | | |

Дзісенскі павет з'яўляўся адным з лідараў у паўночна-заходняй частцы Беларусі не толькі па колькасці стараверскага насельніцтва, але і па колькасці абшчын. Так, у 1897 г. старааверы Дзісенскага павета былі аб'яднаны ў 8 прыходаў, а ў 1911 – у 10 [26, с. 44; 22, с. 54]. На пачатку XX ст. сярод цэнтраў стараверства ў павеце вылучаліся наступныя населеныя пункты: г. Друя, в. Кублішчына, в. Залессе, в. Ластавічы, в. Грыгараўшчына, в. Буеўшчына, в. Барсучына, в. Ніўнікі.

Другім цэнтрам стараверства ў рэгіёне быў Свянцянскі павет. Трэба адзначыць, што каля паловы тэрыторыі Свянцянскага павета ў наш час адносіцца да Літвы. Па сведчанні праваслаўнага епархіяльнага місіянера Д. Губіна, цэнтрам стараверства ў Свянцянскім

павеце была вёска Апідамы (сучасны Пастаўскі раён) [27, с. 51]. Сярод цэнтраў стараверства Свянцянскага павета ў межах Беларусі апроч в. Апідамы былі в. Кукляны, в. Свір, в. Ляшчынава (Стрыпішкі). На беларускіх землях у межах былога Свянцянскага павета да нашага часу захаваліся 4 стараверскія храмы: у в. Апідамы і в. Кукляны (Пастаўскі раён), в. Свір (Мядзельскі раён), в. Стрыпішкі (Астравецкі раён).

Вілейскі павет не адносіўся да ліку густа заселеных старавамі. Значная частка старавераў павета пражывала ў паўночнай яго частцы ў Лучайскай і Манькавіцкай воласці (сучасная тэрыторыя Пастаўскага раёна). Цэнтрамі стараверства тут былі в. Захараўшчына і в. Лучай. Згодна з данымі на 1895 г., стараверы Вілейскага павету сваіх малельняў у межах павета не мелі. Яны належылі да стараверскіх храмаў Барысаўскага павета [28, с. 39]. Але больш познія крыніцы сведчаць аб наяўнасці храмаў у в. Захараўшчына і в. Лучай. Пабудова стараверскага храма ў в. Захараўшчына згадваецца пад 1876 г., а ў в. Лучай – пад 1914 г. [29, с. 321]. Краязнавец Г. Жаброўскі адносіць перасяленне старавераў у ваколіцах в. Захараўшчына да другой паловы XIX ст. і звязвае яго з мерапрыемствамі па каланізацыі краю рускімі перасяленцамі (у тым ліку і стараверамі) пасля падаўлення паўстання 1863 г. У в. Лучай, як сведчаць крыніцы, да пачатку XX ст. стараверы не пражывалі. Іх з’яўленне тут, па сведчанні таго ж Г. Жаброўскага, звязана з курляндскім баронам Клейгельсам. Ён перасяліў сюды старавераў з ваколіц Віцебска [30].

Стараверы Ашмянскага павету таксама не вылучаліся сваёй колькасцю сярод іншых паветаў Віленскай губерні. У канцы XIX – пачатку XX ст., як сведчаць крыніцы, у павеце існавалі 2 абшчыны. Іх цэнтрамі былі засценак Масцішча Галышанскай воласці (тэрыторыя сучаснага Валожынскага раёна) і вёска Новая Слабада Куцавіцкай воласці (сучасны Ашмянскі раён).

У навуковых працах сустракаецца меркаванне, што павелічэнне колькасці стараверскіх храмаў на беларускіх землях напрамую звязана з указам 17 красавіка 1905 г. «Об укреплении начал веротерпимости», у адпаведнасці з якім стараверам, як і прадстаўнікам іншых канфесій, дазвалялася без усякага дазволу будаваць храмы і адчыняць свае прыходы. Аднак, як паказваюць матэрыялы з Віленскай губерні, асноўнае павелічэнне колькасці стараверскіх малельняў адбылася яшчэ да прыняцця гэтага ўказа. Так, згодна са статыстычнымі данымі ў 1879 г. у Віленскай губерні налічвалася 10 стараверскіх малельняў. Да пачатку 1890-х гг. такая колькасць заставалася амаль нязменнай (з павелічэннем на адну да 11, або зноў змяншэннем да 10). У 1891 г. у губерні налічвалася 11 малельняў старавераў, у 1892 г. – 12, у 1893 г. – 15, у 1895 г. – 15, у 1896 г. – 18. А ў 1897 г. іх колькасць дасягнула 22. З іх у г. Друі – 1, Дзісенскім павеце – 8, Ашмянскім павеце – 2, Свянцянскім павеце (без г. Свянцяны) – 4. Такім чынам, з 1891 г. па 1897 г. колькасць стараверскіх малельняў у Віленскай губерні павялічылася ў два разы. У той жа час рост колькасці стараверскіх храмаў у губерні ў пачатку XX ст. не быў такім істотным. Так, у 1906 г. іх налічвалася у губерні 23, у 1907 г. – 25, а у 1911 г. – 26. Пры гэтым на беларускіх землях колькасць малельняў змянілася яшчэ менш. На 1907 г. налічвалася 1 малельня ў г. Друя, 8 – у Дзісенскім павеце, 2 – у Ашмянскім павеце, 5 – у Свянцянскім павеце (без г. Свянцяны). Амаль такая ж карціна характэрна і на 1911 г.: 1 малельня у г. Дзісна, 9 – у Дзісенскім павеце, 2 – у Ашмянскім павеце, 5 – у Свянцянскім павеце (без г. Свянцяны) [31, с. 16; 32, с. 20; 33, с. 19; 34, с. 31; 35, с. 39; 36, с. 33; 26, с. 44; 37, с. 48; 38, с. 49; 22, с. 54].

Значная частка старавераў пражывала ў Новааляксандраўскім павеце Ковенскай губерні, у які ўваходзіла тэрыторыя сучаснага Браслаўскага раёна. У табліцы 3 прадстаўлены даныя аб колькасці старавераў у Новааляксандраўскім павеце.

Табліца 3 – Дынаміка колькасці старавераў і аднаверцаў Новааляксандраўскага павета Ковенскай губерні ў 1863–1913 гг.

| Год | 1863 | 1869 | 1873 | 1879 | 1884 | 1889 | 1894 | 1897 | 1903 | 1909 | 1913 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць старавераў (чал.) | 8265 | 9215 | 11 119 | 13 002 | 13 006 | 11 792 | 13 023 | 18 542 | 13 568 | 26 688 | 29 938 |

Крыніца: складзена аўтарам на аснове [39, с. 82–84; 40, с. 145; 41, с. 142; 42, с. 310; 43, с. 252; 44, с. 334; 45, с. 84; 46, с. 78; 47, с. 66; 48, с. 76; 49, с. 4]. Інфармацыя на 1897 г. прыведзены па перапісу 1897 г. У адпаведнасці з данымі, якія прадстаўлены ў Памятнай кніжцы Ковенскай губерні на 1899 г., на тэрыторыі павета налічвалася 12 490 старавераў і 256 аднаверцаў [50, с. 52].

Пытанне аб колькасці старавераў на беларускіх землях Новааляксандраўскага павета даволі складанае. Некаторую яснасць могуць даць даныя, прыведзеныя ў працы П. І. Карэцкага. Згодна з адміністрацыйным падзелам на той час уся тэрыторыя павета была падзелена на 5 станаў. Два з іх – 2-гі (Відзы) і 3-ці (Браслаў) адносяцца да сучаснай тэрыторыі Беларусі. Як вынікае з прыведзеных П. І. Карэцкім даных, колькасць старавераў у гэтых двух станах на пачатак 1860-х гг. складала каля трэці ад усёй колькасці стараверскага насельніцтва ў Новааляксандраўскім павеце Ковенскай губерні [51, с. 1–28].

Як сведчаць крыніцы, стараверы даволі кампактна пражывалі ва ўсіх валасцях беларускай часткі Новааляксандраўскага павета. Яны жылі ў Браслаўскай, Відзаўскай, Дрысвяцкай, Краснагорскай, Опсаўскай і Слабадской валасцях [51, с. 19–23; 52, с. 70–100]. Тэрыторыя былога Новааляксандраўскага павета і ў сучасны перыяд з'яўляецца аднам з галоўных цэнтраў стараверства ў Беларусі. Да нашага часу на тэрыторыі Браслаўскага раёна захоўваюцца стараверскія абшчыны ў г. Браславе, г.п. Відзы, в. Булавішкі, в. Кірыліна, в. Мікалаюнцы, в. Мінкавічы. Разам з тым на тэрыторыі раёна існуюць і 2 абшчыны, якія раней тэрытарыяльна адносіліся да Дзісенскага павета: у г.п. Друя і в. Буёўшчына.

**Дэмаграфічная характарыстыка.** Даныя ў табліцах 1–3 сведчаць аб устойлівым павелічэнні колькасці старавераў у паўночна-заходняй частцы Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Сур'ёзныя тэмпы росту стараверскага насельніцтва характэрны для беларускіх паветаў Віленскай губерні. Амаль у 2,5 разы павялічылася колькасць старавераў у губерні з 1860 г. па 1911 г. (табліца 1). У Новааляксандраўскім павеце Ковенскай губерні колькасць стараверскага насельніцтва вырасла больш чым у 3,5 разы (з 8265 у 1863 г. да 29 938 у 1913 г., табліца 3).

Як вынікае з крыніц, павелічэнне колькасці стараверскага насельніцтва ў другой палове XIX – пачатку XX ст. на паўночнабеларускіх землях абумоўлена некалькімі прычынамі. У большай ступені яно звязана з натуральным прыростам насельніцтва, які быў характэрны як для ўсёй Расійскай імперыі [53, с. 42, 43, с. 47, 48], так і для беларускіх земляў. Другая палова XIX – пачатак XX ст. характарызуецца хуткім ростам насельніцтва. Толькі за 1860–1890-я гг. насельніцтва Беларусі амаль падвоілася [54, с. 242].

Для тэрыторыі Беларусі не характэрным было павелічэнне старавераў за кошт пераходу ў «раскол» мясцовага насельніцтва. У сваю чаргу далучэнне да стараверства праваслаўнага насельніцтва ў іншых частках Расійскай імперыі ў другой палове XIX ст. было даволі распаюджанай з'явай [55, с. 96]. У крыніцах утрымліваюцца матэрыялы аб пераходзе мясцовага беларускага насельніцтва (пераважна праваслаўнага) у стараверства. Але такія пераходы не мелі шырокага распаўсюджання. Разам з тым з боку царкоўных і цывільных уладаў скіроўваліся захады па далучэнні старавераў да праваслаўнай царквы, што ўвасобілася ў стварэнні аднаверскай царквы. Далучэнне старавераў да праваслаўнай царквы на правах аднаверства найбольшае распаўсюджанне атрымала якраз у Віленскай, Віцебскай і Ковенскай губернях [2, с.138–142; 55, с. 96, 97]. У другой палове XIX – пачатку XX ст. дзякуючы намаганням уладаў частка старавераў перайшла ў праваслаўе. Аднак такія пераходы не насілі масавы характар. Так, згодна са статыстычнымі данымі па Віленскай губерні ў 1882 г. да праваслаўя далучыўся толькі 1 старавер, у 1884 г. – 8, у 1888 г. – 64, у 1894 г. – 19, у 1899 г. – 21 [56, с. 15; 57, с. 11; 58, с. 20; 59, с. 42; 60, с. 50].

Павелічэнне старавераў у рэгіёне было абумоўлена і паляпшэннем іх прававога статуса ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Указы «О даровании раскольникам некоторых прав гражданских и по отправлению духовных треб» ад 3 мая 1883 г. і «Об укреплении начал веротерпимости» ад 17 красавіка 1905 г. істотна палепшылі іх становішча. Істотнае значэнне ў росце колькасці старавераў у рэгіёне мелі мерапрыемствы царскага ўраду па русіфікацыі краю. Асабліва сур'ёзна яны праявіліся пасля паўстання 1863 г. У рэгіёне ствараліся спрыяльныя ўмовы для перасялення сюды рускіх, у тым ліку і старавераў [52].

Асноўная маса старавераў беларускай часткі Віленскай губерні пражывала ў сельскай мясцовасці. Сярод гарадскіх цэнтраў вылучаўся толькі г. Друя ў Дзісенскім павеце. У 1880-х гг. Друя ўвогуле згадвалася як адзін з найбольш заселеных старaверамі горад у Віленскай губерні [56, с. 14]. У другой палове XIX – пачатку XX ст. сярод гарадоў Віленскай губерні па колькасці старавераў Друя саступала толькі Вільні і Свянцянам. У Друі ў 1868 г. налічвалася 85 старавераў,

у 1872 г. – 107, у 1881 г. – 150, 1886 г. – 157, 1890 г. – 246, у 1894 г. – 285, у 1897 г. – 292. Колькасць старавераў у Дзісне ў другой палове XIX ст. была невялікай (не перавышала 10 чалавек, як сведчаць статыстычныя даныя). І толькі на канец XIX ст. іх колькасць у горадзе некалькі вырасла. Згодна з перапісам 1897 г. тут пражывала ўжо 30 старавераў. У г. Ашмяны і г. Вілейка старавераў амаль не фіксавалася [61, с. VI; 62, с. VII; 11, с. 6, 7; 63, с. 62, 63; 25, с. 6, 7; 13, с. 54].

Доля староверскага гарадскога насельніцтва у Новааляксандраўскім павеце таксама не была высокай. На тэрыторыі павета староверы пражывалі ў горадзе Новааляксандраўску і горадзе Відзы. Так, доля гарадскога насельніцтва сярод старавераў у 1869 г. складала 5,8 %, у 1879 – 4,5 %. З 1883 г. назіраецца некаторае павелічэнне долі староверскага гарадскога насельніцтва. Так, у 1884 г. яна складала 6,5 % ад агульнай колькасці старавераў павета. Да пачатку XX ст. лідарам па колькасці гарадскога староверскага насельніцтва ў павеце быў г. Відзы. Так, у 1869 г. тут пражывала 361 старавер, у 1879 г. – 487, у 1884 г. – 737, у 1897 г. – 545, у 1909 г. – 964, у 1913 г. – 1033 [40, с. 145; 42, с. 310; 43, с. 252; 46, с. 78; 48, с. 76; 49, с. 4].

Удзельная вага старавераў у структуры гарадскога насельніцтва Відзаў і Друі была даволі істотнай, у параўнанні з іншымі гарадамі паўночнай Беларусі. Так, па даных на 1897 г. у агульнай структуры гарадскога насельніцтва Відзаў староверы складалі каля 10 %, а ў Друі – каля 6 % [46, с. 78, 79; 13, с. 54, 55].

У другой палове XIX – пачатку XX ст. значная частка старавераў рэгіёна асела ў сельскай мясцовасці і займалася працай на зямлі. Менавіта староверы беларускіх паветаў Віленскай губерні (Дзісенскага, Свянцянскага і Вілейскага) былі больш забяспечаны зямлёй у параўнанні са староверамі астатняй часткі губерні [60, с. 49]. Як сведчаць крыніцы, у канцы XIX – пачатку XX ст. вялікая колькасць старавераў рэгіёна, пераважна малазямельных і беззямельных, была занята рамёствамі, возніцтвам, рыбнай лоўляй, а таксама адыходнымі промысламі. Пашыранымі былі адыходы на працу ў гарады Рыгу, Санкт-Пецярбург, Лібаву (сучасная Ліепая) [52, с. 72, с. 74, 75, с. 84, 85, с. 99, с. 101].

Як вынікае з крыніц, на тэрыторыі рэгіёна пражывала значная частка старавераў па пашпартах з іншых губерняў [51, с. 31, 32; 35, с. 39]. А таму даныя, прадстаўленыя афіцыйнай статыстыкай, год ад года могуць істотна адрозніваецца. Так, у Віленскай губерні ў 1895 г. колькасць старавераў паменшылася ў параўнанні з 1894 г. на 3513 чалавек (на 13,5 %) [35, с. 39]. Такое памяншэнне якраз і тлумачыцца актыўнай міграцыяй староверскага насельніцтва ў гэты перыяд. Даследчык П. І. Карэцкі адзначаў, што «звычка да змены жыхарства прымушае іх пераходзіць па-аднаму, а часам і з сем’ямі ў розныя месцы, гледзячы на тое, дзе найбольш яны знаходзяць для сябе выгаду па сваіх промыслах. Самымі галоўнымі іх заняткамі з’яўляюцца: аселых – у земляробстве, а пераходзячых з месца на месца – збольшага ў нязначным гандлі… але больш у промыслах і работах, з якіх галоўнейшыя: возніцтва, цяслярства, капанне равоў, водкупы садоў і наогул падзённыя работы, якія спрыяюць любімай іх звычцы да змены месцаў» [51, с. 31, 32].

Пра падобны характар у канцы XIX ст. пісаў праваслаўны епархіяльны місіянер Д. Губін. Па яго словах, у Свянцянскім павеце значная колькасць старавераў займалася адыходнымі промысламі: «Для кожнай публічнай гутаркі мне даводзілася здзяйсняць заўсёды самастойную паездку. І гэта таму, што днём гутаркі магло быць выключна свята, у якое, пераважна, мужчыны-староверы бываюць дома. У астатнія ж дні тыдня вялікая частка мужчын-старавераў разыходзіцца на заробак: узімку – на высечку і вывазку лесу для лесапрамыслоўцаў і бліжэйшых памешчыкаў, улетку ж выдаляюцца ад сям’і часам нават на далёкія адлегласці для распілоўкі ў тых ці іншых уладальнікаў запасных дрэў на дошкі. Апошняя акалічнасць, між іншым, у сувязі з адыходным промыслам у Пецярбург і ў чыгуначныя арцелі робіць зусім немагчымым для місіянера вядзенне публічных гутарак за час ад другой паловы красавіка да кастрычніка месяца» [27, с. 51].

У даследаванні староверства даволі складаным з’яўляецца пытанне іх адукацыйнага ўзроўню. Царкоўныя і цывільныя ўлады, а таксама даследчыкі другой паловы XIX – пачатку XX ст. даволі нізка ацэньвалі ўзровень адукацыі староверскага насельніцтва. А таму ў публікацыях таго перыяду характарыстыка старавераў рэгіёна выглядала наступным чынам: «Разумовае развіццё раскольнікаў не высокае, бо яны, у большай частцы, непісьменныя і дзяцей

сваіх, за малым выключэннем, грамаце не навучаюць» [17, с. 99]. Трэба прызнаць, што такая характарыстыка пацвярджаецца і афіцыйнымі статыстычнымі данымі. Так, згодна з перапісам 1897 г. у Віленскай губерні доля адукаваных сярод стараверскага насельніцтва была даволі нізкай. У мужчынскага насельніцтва яна складала 16,8 %, а ў жаночага – толькі 2,5 %. Па гэтаму паказчыку старавер сы саступалі ўсім асноўным канфесіям (пратэстантам, іудзеям, каталікам і праваслаўным) [13, с. VIII]. Але разам з тым трэба адзначыць, што афіцыйная статыстыка не ў поўнай меры адлюстроўвае рэальную карціну. Як правіла, дзеці стараве раў атрымлівалі хатнюю адукацыю. Навучанне ж стараверскіх дзяцей у агульных школах з-за рэлігійных перакананняў было мала пашыраным. Аднак у канцы XIX – пачатку XX ст. ранейшыя перашкоды на шляху атрымання стараверскімі дзецьмі агульнай адукацыі сціраюцца. Пра гэта сведчаць і павелічэнне колькасці стараве раў у агульнаадукацыйных школах [55, с. 98], а таксама захады самога стараверскага насельніцтва на адкрыццё такіх школ. Так, па сведчанні праваслаўнага епархіяльнага місіянера Д. Губіна, у в. Апідамы Свянцянскага павета (сучасны Пастаўскі раён) старавер ы ў 1894 г. хадайнічалі аб адкрыцці школы ў вёсцы [27, с. 53].

**Заключэнне.** Такім чынам, на аснове аналізу крыніц прыходзім да наступных высноў. У другой палове XIX – пачатку XX ст. значная частка стараверскага насельніцтва Беларусі пражывала ў паўночна-заходняй яе частцы. Гэты рэгіён з’яўляўся адным з лідараў па колькасці стараве раў на беларускіх землях. Месцамі кампактнага пражывання стараве раў былі тэрыторыі Дзісенскага, Свянцянскага, Новааляксандраўскага, Ашмянскага і Вілейскага паветаў. У другой палове XIX – пачатку XX ст. назіраецца ўстойлівае павелічэнне стараверскага насельніцтва на тэрыторыі паўночна-заходняй Беларусі. Пераважная большасць стараверскага насельніцтва рэгіёна пражывала ў сельскай мясцовасці, доля гаражанаў сярод стараве раў была невялікай. Асноўнымі гарадскімі цэнтрамі паўночна-заходняй Беларусі, дзе налічвалася значная колькасць стараве раў, былі Відзы і Друя (сучасны Браслаўскі раён). У выніку сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсаў другой паловы XIX – пачатку XX ст. актывізуецца міграцыя стараверскага насельніцтва як у рэгіёне, так і за яго межы. Як вынікае з крыніц, адукацыйны ўзровень стараве раў рэгіёна быў даволі нізкім. Па гэтаму паказчыку яны саступалі ўсім асноўным канфесіям.

## *СПІС ЛІТАРАТУРЫ*


1. *Аўсейчык, У. Я.* Гісторыя вывучэння стараве раў Паўночнай Беларусі / У. Я. Аўсейчык // Вестник ПГУ. Серия А. Гуманитарные науки. Исторические науки. – 2020. – № 1. – С. 18–32.

2. *Гарбацкі, А. А.* Стараабрадніцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX ст. / А. А. Гарбацкі. – Брэст : БрДУ, 1999. – 202 с.

3. *Минина, Н. Е.* Островные русские говоры Витебщины / Н. Е. Минина. – Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2003. – 159 с.

4. *Поташенко, Г.* Староверие в Литве: Вторая половина XVII – начало XIX в. Исследования, документы, материалы / Г. Поташенко. – Вильнюс : Aidai, 2006. – 543 с.

5. *Морозова, Н.* Староверы Литвы: к вопросу о местах компактного проживания в прошлом и настоящем / Н. Морозова // Перекрестки. – 2012. – № 3–4. – С. 136–147.

6. Памятная книжка Виленской губернии на 1861 год. – Вильна : Печ. А. Г. Сыркина, 1861. – Ч. 2. – 205 с.

7. Памятная книжка Виленской губернии на 1870 год. – Вильна : Тип. губ. правл., 1870. – VIII, 253, XXXVI с.

8. Памятная книжка Виленской губернии на 1875 год. – Вильна : Печ. А. Г. Сыркина, 1875. – VIII, 244, LXVI с.

9. Памятная книжка Виленской губернии на 1880 год. – Вильна : Печ. А. Г. Сыркина, 1879. – VIII, 253, XCI с.

10. Памятная книжка Виленской губернии на 1884 год. – Вильна : Тип. губ. правл., 1883. – VIII, 283, LXXV с.

11. Памятная книжка Виленской губернии на 1888 год. – Вильна : Губ. тип., 1887. – XII, XL, 341, 136 с.

12. Памятная книжка Виленской губернии на 1893 год. – Вильна : Губ. тип., 1892. – XII, 436, 167 с.

13. Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 года / Изд. Центр. Стат. комитетом М-ва вн. дел ; под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Тип. Спб. акц. общ. «Слово». – Вып. 4 : Виленская губерния. Тетрадь 3. – 1904. – [4], XII, 179 с.

14. Памятная книжка Виленской губернии на 1904 год. – Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1904. – XIV, 247, 54, 87 с.

15. Памятная книжка Виленской губернии на 1909 год. – Вильна : Губ. тип., 1909. – XVI, 175, 124, 42, 101 с.

16. Памятная книжка Виленской губернии на 1913 год. – Вильна : Губ. тип., 1913. – XV, 215, 64 с.
17. Памятная книжка Виленской губернии на 1899 год. – Вильна : Губ. тип., 1898. – XIX, 60, 321, 431 с.
18. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. / Изд. Центр. Стат. комитетом М-ва вн. дел; Под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Тип. С.-Петербургской тюрьмы. – [Вып.] 11 : Гродненская губерния. – 1904. – [4], XVI, 319 с.
19. Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 года / Изд. Центр. Стат. комитетом М-ва вн. дел ; под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Тип. С.-Петербургской тюрьмы. – [Вып.] 22 : Минская губерния. – 1904. – [4], XVI, 243 с.
20. Обзор Виленской губернии за 1903 год. – Вильна : Губ. тип., 1904. – [4], 95, [59] с.
21. Обзор Виленской губернии за 1908 год. – Вильна : Губ. тип., 1909. – [4], 99, [61] с.
22. Обзор Виленской губернии за 1911 год. – Вильна : Губ. тип., 1913. – [4], 102, [77] с.
23. Памятная книжка Виленской губернии на 1845 год. – Вильна : Тип. А. Дворца, 1845. – 285, 64, 4 с.
24. Памятная книжка Виленской губернии на 1878 год. – Вильна : Печ. А. Г. Сыркина, 1877. – VIII, 256, LXVI с.
25. Памятная книжка Виленской губернии на 1896 год. – Вильна : Губ. тип., 1895. – X, 408, 106 с.
26. Обзор Виленской губернии за 1897 год. – Вильна : Губ. тип., 1898. – [4], 98, [55] с.
27. *Губин, Д.* Отчет о деятельности в течение 1893 года противораскольническаго епархиальнаго миссионера священника Димитрия Губина и помощника его Климентия Фомина Букина / Д. Губин // Литовские епархиальные ведомости. – 1894. – № 7. – С. 51–54.
28. Обзор Виленской губернии за 1895 год. – Вильна : Губ. тип., 1896. – [4], 73, [37] с.
29. Gminy wyznaniowe Wschodniego Kościoła Staroobrzędowego w Polsce // Archiwum Akt Nowych. – Zesp. 14 : Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego w Warszawie. – Syg. 1270 : Kościół Staroobrzędowy nieuznający hierarchii (1922–1939). – S. 318–322.
30. *Жаброўскі, Г.* Манаграфія вёскі Міхнічы і ваколіц у Пастаўскім павеце на Віленшчыне / Г. Жаброўскі. – Паставы : Сумежжа, 2005. – 120 с.
31. Обзор Виленской губернии за 1879 год. – Вильна : Губ. тип., 1880. – [3], 34, [33] с.
32. Обзор Виленской губернии за 1891 год. – Вильна : Губ. тип., 1892. – [4], 52, [1] с.
33. Обзор Виленской губернии за 1892 год. – Вильна : Губ. тип., 1893. – [4], 53, [1] с.
34. Обзор Виленской губернии за 1893 год. – Вильна : Губ. тип., 1894. – [4], 69, [1] с.
35. Обзор Виленской губернии за 1895 год. – Вильна : Губ. тип., 1896. – [4], 73, [37] с.
36. Обзор Виленской губернии за 1896 год. – Вильна : Губ. тип., 1897. – [4], 74, [55] с.
37. Обзор Виленской губернии за 1906 год. – Вильна : Губ. тип., 1907. – [4], 96, [61] с.
38. Обзор Виленской губернии за 1907 год. – Вильна : Губ. тип., 1908. – [4], 98, [61] с.
39. Памятная книжка Ковенской губернии на 1864 год. – Ковно : Тип. Ш. Соколовского, 1864. – Ч. 2. – 140 с.
40. Памятная книжка Ковенской губернии на 1871 год. – Ковно : Тип. губ. правл., 1870. – 188 с.
41. Памятная книжка Ковенской губернии на 1875 год. – Ковно : Тип. губ. правл., 1874. – 244 с.
42. Памятная книжка Ковенской губернии на 1881 год. – Ковно : Тип. губ. правл., 1880. – 379 с., 1 л.
43. Памятная книжка Ковенской губернии на 1886 год. – Ковно : Тип. губ. правл., 1885. – 402 с.
44. Памятная книжка Ковенской губернии на 1891 год. – Ковно : Тип. губ. правл., 1890. – 461, 15 с., 1 л.
45. Памятная книжка Ковенской губернии на 1896 год. – Ковно : Тип. губ. правл., 1895. – 260, 246 с.
46. Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 года / Изд. Центр. Стат. комитетом М-ва вн. дел ; под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Тип. Э. Л. Пороховщиковой. – Вып. 17 : Ковенская губерния. – 1904. – [4], XII, 228 с.
47. Памятная книжка Ковенской губернии на 1905 год. – Ковно : Тип. губ. правл., 1904. – 184, 70, 132, XXV, 3 с.
48. Памятная книжка Ковенской губернии на 1911 год. – Ковно : Губ. тип., 1910. – XLVIII, 166, 79, XXXIV, 156 с.
49. Памятная книжка Ковенской губернии на 1915 год. – Ковно : Губ. тип., 1914. – XXIV, 147, 74, 14, 34 с.
50. Памятная книжка Ковенской губернии на 1899 год. – Ковно : Тип. губ. правл., 1898. – 262, 78, 144 с.
51. *Корецкий, П. И.* О раскольниках в Ковенской губернии / П. И. Корецкий // Памятная книжка Ковенской губернии на 1863 год. – Ковно : Тип. Ш. Соколовского, 1863. – Отдел II. – С. 1–46.
52. *Станкевич, А.* Очерк возникновения русских поселений на Литве / А. Станкевич. – Вильна : Губ. тип., 1909. – 140 с.
53. *Рашин, А. Г.* Население России за 100 лет (1811–1913 гг.). Статистические очерки / А. Г. Рашин. – М. : Гос. стат. изд.-во, 1956. – 352 с.
54. *Пірожнік, І. І.* Насельніцтва Беларусі і дэмаграфічныя працэсы / І. І. Пірожнік // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мінск : БелЭн, 2000. – С. 242–251.
55. Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX ст.) / В. В. Грыгор’ева [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 1998. – 340 с.
56. Обзор Виленской губернии за 1882 год. – Вильна : Губ. тип., 1883. – [4], 30, [10] с.
57. Обзор Виленской губернии за 1884 год. – Вильна : Губ. тип., 1885. – [4], 24, [25] с.
58. Обзор Виленской губернии за 1888 год. – Вильна : Губ. тип., 1889. – [4], 46, [53] с.

59. Обзор Виленской губернии за 1894 год. – Вильна : Губ. тип., 1895. – [4], 88, [33] с.
60. Обзор Виленской губернии за 1899 год. – Вильна : Губ. тип., 1900. – [4], 100, [55] с.
61. Памятная книжка Виленской губернии на 1874 год. – Вильна : Печ. А. Г. Сыркина, 1874. – VIII, 242, LXVIII с.
62. Памятная книжка Виленской губернии на 1883 год. – Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1882. – VIII, 270, LXXVII с.
63. Памятная книжка Виленской губернии на 1892 год. – Вильна : Губ. тип., 1891. – XII, 67, 403, 187 с.

Паступіў у рэдакцыю 16.09.2020.

"Vesnik of Yanka Kupala State University of Grodno. Series 1. History and Archaeology. Philosophy. Political Science"
Vol. 13, No. 1, 2021, pp. 57–67
© Yanka Kupala State University of Grodno, 2021

## Settlement and demographic characteristics of Old Believers of northwestern Belarus in the second half of the 19th and early 20th centuries

**U. Ya. Auseichyk**

*Polotsk State University (Belarus)*
Blokhina St., 29, 211440, Novopolotsk, Belarus; e-mail: u.auseichyk@psu.by

**Abstract.** The introduction outlines the relevance and purpose of the survey and briefly describes the historiography of the problem. It concludes that there are no special works on this issue. It is pointed out that the aim of the study is to identify settlement features and analyze demographic processes among Old Believers in the north-western part of Belarus in the 19th and early 20th centuries. The territorial boundaries of the study, which cover north-western Belarus, have been defined. In accordance with the administrative and territorial division of the second half of the 19th and early 20th centuries, the territories of the eastern counties of Vilnius Province and the eastern part of Novoalexandrovski County of Kovenski Province serve as a region. The source base for the study was determined. A set of statistical materials from the second half of the 19th and early 20th centuries has become available. In the main part of the work, the peculiarities of settlement have been identified and demographic characteristics of the Old Believers' population of North-West Belarus have been given on the basis of materials of the second half of the 19th – early 20th centuries. The article deals with the dynamics of the Old Believers' population in the region as a whole and by individual administrative units. It identifies the main places of their compact residence within the region, analyzes the ratio of rural to urban Old Believers, identified urban centers of Old Believers in north-western Belarus. The conclusion was drawn that the north-western part of Belarus in the second half of the 19th and early 20th centuries was a region of compact Old Believers' residence. In the second half of the 19th and early 20th centuries, there was a steady increase in the Old Believers' population in this part of the country. The majority of the Old Believers in the region lived in rural areas and the share of urban dwellers among Old Believers was small. As a result of socio-economic and political processes in the second half of the 19th and early 20th centuries, the migration of Old Believers both in the region and abroad is intensifying.

**Keywords:** Old Believers, North-Western Belarus, settlement, population, demographic processes, statistical materials.

## References

1. Auseichyk U. Ya. History of the study of the Old Believers of Northern Belarus [*Historyia vyvuchennia staraverau Paunochnai Belarusi*]. *Herald of Polotsk State University. Series A. Humanity sciences*, 2020, No 1, pp. 18-32.
2. Garbatski A. A. Old Believers in Belarus in the late 17th - early 20th centuries [*Staraabradnitstva na Belarusi u kantsy XVII - pachatku XX st.*]. Brest, 1999, 202 p.
3. Minina N. E. Island Russian dialects of Vitebsk region [*Ostrovnye russkie govory Vitebshchiny*]. Vitebsk, 2003, 159 p.
4. Potashenko G. Old Belief in Lithuania: Second half of the 17th - early 19th centuries. Research, documents, materials [*Staroverie v Litve: Vtoraia polovina XVII - nachalo XIX v. Issledovaniia, dokumenty, materialy*]. Vilnius, 2006, 543 p.
5. Morozova N. Lithuanian Old Believers: on the issue of places of compact residence in the past and present [*Starovery Litvy: k voprosu o mestakh kompaktnogo prozhivaniia v proshlom i nastoiashchem*]. Crossroads, 2012, No. 3-4, pp. 136-147.
6. Commemorative book of the Vilnius province for 1861 [*Pamiatnaia knizhka Vilenskoi gubernii na 1861 god*]. Vilnius, 1861, part 2, 205 p.

7. Commemorative book of the Vilnius province for 1870 [*Pamiatnaia knizhka Vilenskoi gubernii na 1870 god*]. Vilnius, 1870, VIII, 253, XXXVI p.

8. Commemorative book of the Vilnius province for 1875 [*Pamiatnaia knizhka Vilenskoi gubernii na 1875 god*]. Vilnius, 1875, VIII, 244, LXVI p.

9. Commemorative book of the Vilnius province for 1880 [*Pamiatnaia knizhka Vilenskoi gubernii na 1880 god*]. Vilnius, 1879, VIII, 253, XCI p.

10. Commemorative book of the Vilnius province for 1884 [*Pamiatnaia knizhka Vilenskoi gubernii na 1884 god*]. Vilnius, 1883, VII, 283, LXXV p.

11. Commemorative book of the Vilnius province for 1888 [*Pamiatnaia knizhka Vilenskoi gubernii na 1888 god*]. Vilnius, 1887, XII, XL, 341, 136 p.

12. Commemorative book of the Vilnius province for 1888 [*Pamiatnaia knizhka Vilenskoi gubernii na 1893 god*]. Vilnius, 1892, XII, 436, 167 p.

13. The First General Census of the Russian Empire in 1897. Issue 4: Vilnius province, T. 3 [*Pervaia vseobshchaia perepis' naseleniia Rossiiskoi imperii 1897 goda. Vyp. 4 : Vilenskaia guberniia. Tetrad' 3*]; Ed. by N. A. Troinitski. St. Petersburg, 1904, [4], XII, 179 p.

14. Commemorative book of the Vilnius province for 1904 [*Pamiatnaia knizhka Vilenskoi gubernii na 1904 god*]. Vilnius, 1904, XIV, 247, 54, 87 p.

15. Commemorative book of the Vilnius province for 1909 [*Pamiatnaia knizhka Vilenskoi gubernii na 1909 god*]. Vilnius, 1909, XVI, 175, 124, 42, 101 p.

16. Commemorative book of the Vilnius province for 1913 [*Pamiatnaia knizhka Vilenskoi gubernii na 1913 god*]. Vilnius, 1913, XV, 215, 64 p.

17. Commemorative book of the Vilnius province for 1899 [*Pamiatnaia knizhka Vilenskoi gubernii na 1899 god*]. Vilnius, 1898, XIX, 60, 321, 431 p.

18. The First General Census of the Russian Empire in 1897. Issue 11 : Grodno province [*Pervaia vseobshchaia perepis' naseleniia Rossiiskoi imperii 1897 goda. Vyp. 11 : Grodnenskaia guberniia*]; Ed. by N. A. Troinitski. St. Petersburg, 1904, [4], XVI, 319 p.

19. The First General Census of the Russian Empire in 1897. Issue 22 : Minsk province [*Pervaia vseobshchaia perepis' naseleniia Rossiiskoi imperii 1897 goda. Vyp. 22 : Minskaia guberniia*]. St. Petersburg, 1904, [4], XVI, 243 p.

20. Overview of the Vilnius province for 1903 [*Obzor Vilenskoi gubernii za 1903 god*]. Vilnius, 1904, [4], 95, [59] p.

21. Overview of the Vilnius province for 1908 [*Obzor Vilenskoi gubernii za 1908 god*]. Vilnius, 1909, [4], 99, [61] p.

22. Overview of the Vilnius province for 1911 [*Obzor Vilenskoi gubernii za 1911 god*]. Vilnius, 1913, [4], 102, [77] p.

23. Commemorative book of the Vilnius province for 1845 [*Pamiatnaia knizhka Vilenskoi gubernii na 1845 god*]. Vilnius, 1845, 285, 64, 4 p.

24. Commemorative book of the Vilnius province for 1878 [*Pamiatnaia knizhka Vilenskoi gubernii na 1878 god*]. Vilnius, 1877, VIII, 256, LXVI p.

25. Commemorative book of the Vilnius province for 1896 [*Pamiatnaia knizhka Vilenskoi gubernii na 1896 god*]. Vilnius, 1895, X, 408, 106 p.

26. Overview of the Vilnius province for 1897 [*Obzor Vilenskoi gubernii za 1897 god*]. Vilnius, 1898, [4], 98, [55] p.

27. Gubin D. Report on the activities during the year 1893 of the anti-divine diocesan missionary priest Dimitry Gubin and his assistant Clement Fomin Bukin [*Otchet o deiatel'nosti v techenie 1893 goda protivoraskol'nicheskago eparkhial'nago missionera sviashchennika Dimitriia Gubina i pomoshchnika ego Klimentiia Fomina Bukina*]. *Lithuanian diocesan sheets*, 1894, No. 7, pp. 51-54.

28. Overview of the Vilnius province for 1895 [*Obzor Vilenskoi gubernii za 1895 god*]. Vilnius, 1896, [4], 73, [37] p.

29. The religious communities of the Eastern Orthodox Church in Poland. Archive of New Files. L. 14: Ministry of Religious Denominations and Public Enlightenment in Warsaw. C. 1270: The Old Believing Church without hierarchy (1922-1939) [*Gminy wyznaniowe Wschodniego Kościóła Staroobrzędowego w Polsce. Archiwum Akt Nowych, Zesp. 14: Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego w Warszawie. Syg. 1270: Kościół Staroobrzędowy nieuznający hierarchii (1922-1939)*]. pp. 318-322.

30. Zhabrouski H. Monograph of the village of Michnichy and its environs in the Postavy district in the Vilnius region [*Managrafiia veski Mikhnichy i vakolits u Pastauskim pavetse na Vilenshchyne*]. Postavy, 2005, 120 p.

31. Overview of the Vilnius province for 1879 [*Obzor Vilenskoi gubernii za 1879 god*]. Vilnius, 1880, [3], 34, [33] p.

32. Overview of the Vilnius province for 1891 [*Obzor Vilenskoi gubernii za 1891 god*]. Vilnius, 1892, [4], 52, [1] p.

33. Overview of the Vilnius province for 1892 [*Obzor Vilenskoi gubernii za 1892 god*]. Vilnius, 1893, [4], 53, [1] p.

34. Overview of the Vilnius province for 1893 [*Obzor Vilenskoi gubernii za 1893 god*]. Vilnius, 1894, [4], 69, [1] p.

35. Overview of the Vilnius province for 1895 [*Obzor Vilenskoi gubernii za 1895 god*]. Vilnius, 1896, [4], 73, [37] p.

36. Overview of the Vilnius province for 1896 [*Obzor Vilenskoi gubernii za 1896 god*]. Vilnius, 1897, [4], 74, [55] p.

37. Overview of the Vilnius province for 1906 [*Obzor Vilenskoi gubernii za 1906 god*]. Vilnius, 1907, [4], 96, [61] p.

38. Overview of the Vilnius province for 1907 [*Obzor Vilenskoi gubernii za 1907 god*]. Vilnius, 1908, [4], 98, [61] p.

39. Commemorative book of the Kaunas province for 1864 [*Pamiatnaia knizhka Kovenskoi gubernii na 1864 god*]. Kaunas, 1864, vol. 2, 140 p.

40. Commemorative book of the Kaunas province for 1871 [*Pamiatnaia knizhka Kovenskoi gubernii na 1871 god*]. Kaunas, 1870, 188 p.

41. Commemorative book of the Kaunas province for 1875 [*Pamiatnaia knizhka Kovenskoi gubernii na 1875 god*]. Kaunas, 1874, 244 p.

42. Commemorative book of the Kaunas province for 1881 [*Pamiatnaia knizhka Kovenskoi gubernii na 1881 god*]. Kaunas, 1880, 379 p., 1 p.

43. Commemorative book of the Kaunas province for 1886 [*Pamiatnaia knizhka Kovenskoi gubernii na 1886 god*]. Kaunas, 1885, 402 p.

44. Commemorative book of the Kaunas province for 1891 [*Pamiatnaia knizhka Kovenskoi gubernii na 1891 god*]. Kaunas, 1890, 461, 15 p., 1 p.

45. Commemorative book of the Kaunas province for 1896 [*Pamiatnaia knizhka Kovenskoi gubernii na 1896 god*]. Kaunas, 1895, 260, 246 p.

46. The First General Census of the Russian Empire in 1897. Issue 17 : Kaunas province [*Pervaia vseobshchaia perepis' naseleniia Rossiiskoi imperii 1897 goda. Vyp. 17 : Kovenskaia guberniia*]; Ed. by N. A. Troinitski. St. Petersburg, 1904, [4], XII, 228 p.

47. Commemorative book of the Kaunas province for 1905 [*Pamiatnaia knizhka Kovenskoi gubernii na 1905 god*]. Kaunas, 1904, 184, 70, 132, XXV, 3 p.

48. Commemorative book of the Kaunas province for 1911 [*Pamiatnaia knizhka Kovenskoi gubernii na 1911 god*]. Kaunas, 1910, XLVIII, 166, 79, XXXIV, 156 p.

49. Commemorative book of the Kaunas province for 1915 [*Pamiatnaia knizhka Kovenskoi gubernii na 1915 god*]. Kaunas, 1914, XXIV, 147, 74, 14, 34 p.

50. Commemorative book of the Kaunas province for 1899 [*Pamiatnaia knizhka Kovenskoi gubernii na 1899 god*]. Kaunas, 1898, 262, 78, 144 p.

51. Koretski P. I. About the schismatics in the Kaunas province [*O raskol'nikakh v Kovenskoi gubernii*]. Commemorative book of the Kaunas province for 1863 [*Pamiatnaia knizhka Kovenskoi gubernii na 1863 god*]. Kaunas, 1863, section II, pp. 1-46.

52. Stankevich A. Essay on the emergence of Russian settlements in Lithuania [*Ocherk vozniknoveniia russkikh poselenii na Litve*]. Vilnius, 1909, 140 p.

53. Rashin A. G. The population of Russia for 100 years (1811-1913). Statistical essays [*Naselenie Rossii za 100 let (1811-1913 gg.). Statisticheskie ocherki*]. Moscow, 1956, 352 p.

54. Pirozhnik I. I. The population of Belarus and demographic processes [*Nasel'nitstva Belarusi i demahrafichnyia pratsesy*]. Belarus is at the turn of the millennium [*Belarus' na miazhy tysiachahoddziau*]. Minsk, 2000, pp. 242-251.

55. Denominations in Belarus (late 18th - 20th centuries) [*Kanfesii na Belarusi (k. XVIII - XX st.)*]. Minsk, 1998, 340 p.

56. Overview of the Vilnius province for 1882 [*Obzor Vilenskoi gubernii za 1882 god*]. Vilnius, 1883, [4], 30, [10] p.

57. Overview of the Vilnius province for 1884 [*Obzor Vilenskoi gubernii za 1884 god*]. Vilnius, 1885, [4], 24, [25] p.

58. Overview of the Vilnius province for 1888 [*Obzor Vilenskoi gubernii za 1888 god*]. Vilnius, 1889, [4], 46, [53] p.

59. Overview of the Vilnius province for 1894 [*Obzor Vilenskoi gubernii za 1894 god*]. Vilnius, 1895, [4], 88, [33] p.

60. Overview of the Vilnius province for 1899 [*Obzor Vilenskoi gubernii za 1899 god*]. Vilnius, 1900, [4], 100, [55] p.

61. Commemorative book of the Vilnius province for 1874 [*Pamiatnaia knizhka Vilenskoi gubernii na 1874 god*]. Vilnius, 1874, VIII, 242, LXVIII p.

62. Commemorative book of the Vilnius province for 1883 [*Pamiatnaia knizhka Vilenskoi gubernii na 1883 god*]. Vilnius, 1882, VIII, 270, LXXVII p.

63. Commemorative book of the Vilnius province for 1892 [*Pamiatnaia knizhka Vilenskoi gubernii na 1892 god*]. Vilnius,1891, XII, 67, 403, 187 p.